УДК 821.161.3.09

ВЕРШЫ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА НА БАЛГАРСКАЙ МОВЕ

Жыркевіч Т. І. (Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова», кафедра літаратуры і міжкультурных камунікацый)

Анатацыя. Артыкул змяшчае звесткі аб пануючых перакладах вершаў М. Багдановіча на балгарскай мове і спецыфіцы перакладчыцкай дзейнасці балгарскіх літаратараў.

Творчасць М. Багдановіча пануе ў балгарскім літаратурным асяроддзі з другой паловы XX ст., калі сталі наладжвацца пашыраныя літаратурныя кантакты паміж Беларуссю і

Архив библиотеки МГУ имени А

Балгарыяй. Вершы М. Багдановіча звярнулі ўвагу балгарскіх літаратараў "вытанчанасцю радка, высакароднай думкай і эмацыйнай свежасцю" [1, с. 45], паэтычным эксперыментам, наватарствам у беларускім вершаскладанні, распрацоўкай (разам з Янкам Купалам) беларускай пейзажнай, любоўнай і філасофскай лірыкі, таксама шматлікімі перакладамі. "Багдановіч з зайздроснай эрудыцыяй і бездакорным густам перакладаў на беларускую мову антычныя, еўрапейскія і сусветныя паэтычныя вобразы, каб паказаць магчымасць роднай мовы" [1, с. 46].

Сярод папулярызатараў твораў М. Багдановіча вылучаюцца Андрэй Германаў, Хрыста Папоў, Найдан Вылчаў. Пераклады змяшчаліся на старонках балгарскіх газет "Литературен форум", "Български писател", часопіса "Панорама". Вядомы зборнікі перакладаў вершаў М. Багдановіча "Златни струни" (1984) Хрыста Папова, куды ўвайшло 75 вершаў беларускага паэта, і "Беларуската моя тетрадка" (2000) Найдана Вылчава. Агульнымі для абодвух перакладчыкаў сталі наступныя вершы М. Багдановіча: "Санет" ("Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі"), "Мае песні", "Слуцкія ткачыхі", "Раманс" ("Зорка Венера ўзышла над зямлёю"), "Не кувай ты, шэрая зязюля", "Санет" ("Замёрзла ноччу шпаркая крыніца"), "Маёвая песня" ("Па-над белым пухам вішняў"), "Перад павадкай", "С. Палуяну" ("Ты быў, як месяц, адзінокі").

Пераствaрэнне мастацкага твора – гэта заўсёды складаны працэс. Перакладчык павінеи мець не толькі выдатныя здольнасці інтэрпрэтатара іншанацыянальнай літаратуры, але і пранікаць у самую сутнасць яе, спасцігаць мастацкія вартасці твора. Калі творчасць якога-небудзь паэта западае ў душу пераствaральніка, адпавядае яго ўласным думкам, тады, як заўважае Х. Папоў, "праца перакладчыка становіцца прыемнай і прыносіць глыбокае задавальненне". Менавіта гэтыя суб'ектыўныя фактары дазваляюць узнікаць і існаваць у адным літаратурным асяроддзі розным варыянтам пэўнага твора.

Успрыняцце арыгіналу праходзіць этап, пры якім перакладчык вылучае для сябе асноўныя асаблівасці тэксту, якія трэба захаваць у перакладзе. Кожны з варыянтаў гучыць па-свойму, мае адметныя рысы. Перакладчыкі карысталіся ўласнымі поглядамі, каб узнавіць твор на роднай мове. Яны імкнуліся не проста адлюстраваць твор па-балгарску, але і паказаць свае адносіны да яго, своё разумение ідэйнага сэнсу.

Пераклад твора падпарадкоўваецца пэўным законам. Адзін з іх патрабуе перадачы сэнсавай дакладнасці арыгінала, так званай аўтарскай канцэпцыі твора, што выяўляецца ў сэнсавых адзінках.

Для параўнання можна ўзяць вершы беларускага мастака ў перакладах Н. Вылчава і Х. Папова. На аснове іх дэталёвага аналізу можна вызначыць, што Найдан Вылчаў робіць акцэнт на ідэйна-эмацыйнам змесце лірыкі беларускага паэта, таму вызначаецца шмат лексічных недакладнасцей (сэнсавых адзінак з твора М. Багдановіча у перакладзе ўзнаўляецца толькі каля 30%). Акрамя таго, Н. Вылчаў уводзіць вобразы, якіх няма ў арыгінале (напрыклад, у вершы "Слуцкія ткачыхі" гэта *нищелки, бърдо* (часткі ткацкга станка), *колани слуцки, крайслуцка*, што ўказвае на месца дзеяння Слуцк). Пераклады Н. Вылчава можна назваць вольным пераствaрэннем, дзе арыгінальная аўтарская ідэя захоўваецца, але сродкі выразу і вобразная сістэма падвяргаюцца пэўным змяненням.

У перакладах Х. Папова ўзнаўлены каля 80% сэнсавых адзінак арыгінальнага твора. Перакладчык звяртае ўвагу на шматкаляровасць ў апісанні прыроды, сінтаксічную дынаміку (напрыклад, такое ж багацце дзеясловаў), асаблівую чуллівасць і дасканаласць форм. Праз пераклады Х. Папова М. Багдановіч успрымаецца не толькі як паэт, які раскрывае сацыяльную тэматыку ў сваёй творчасці, але і як мастак пачатку XX стагоддзя, з характэрнымі для таго часу мастацкімі прыёмамі сімвалістычнага напрамку (яркая каляровасць, роля сімвалаў). Гэта ўскосна апраўдвае знешні воблік зборніка "Златни стру-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ни” з нежным дзявочым тварам на вокладцы. Ён адразу настройвае чытача на пэўны лад – сустрэчу з Паэтам, які ўслаўляе прыгажосць і свабоду, гармонію чалавека з прыродай.

Мастацкі пераклад мае два бакі: ён уяўляе не толькі “пераклад” твора з адной мовы на іншую, але і “перавод” яго з адной нацыянальнай культуры ў другую. І ступень успрымання чытачом дадзенага твора шмат у чым залежыць ад перакладчыка, ад таго, наколькі тэкст выклікаў у ім водгук і суаднёсся з душэўным настроем, што дазваляе глыбей пранікнуць у нацыянальныя асаблівасці перакладчага матэрыялу і знайсці адэкватныя выразы ва ўласнай мове.

Літаратура

1. Багданович, Максим. Златни струни. Превод от белоруски Христо Попов / Максим Багданович. – София: Народна култура, 1984. – 115 с.

2. Багдановіч, Максім. Поўны збор твораў: у 3 т. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследванні, чарнавыя накіды. / М. Багдановіч – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 752 с.

3. Владимиров, Симеон. Двойният живот на Максим Богданович / Симеон Владимиров // Максим Багданович. Златни струни. Превод от белоруски Христо Попов. – София: Народны писател, 1984. – 120 с.

4. Вълчев, Георги. Приобщения: литературни контакти и аналогии / Г. Вълчев. – София: Народна просвета, 1971. – 137 с.

5. Вълчев, Найден. Белоруската моя тетрадка. Избрани преводи. / Н. Вълчев. – Мінск: “Беллітфонд”, 2000. – 279 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова